**Новости института**

- Обновлено 28.10.2019 14:15

Опубликовано 28.10.2019 10:40

Автор: ОПРИиОС

Просмотров: 155

Міжнародны круглы стол у рэжыме "онлайн" арганізавалі сумесна кафедра філасофіі і паліталогіі Омскай акадэміі МУС Расіі і кафедра сацыяльна-гуманітарных дысцыплін Магілёўскага інстытута МУС.

Мерапрыемства прайшло ў межах навуковай канферэнцыі "Анталогія і аксіялогія права", якая праходзіла ў Омску. Тэма круглага стала была вызначана як "Тэхналагічная рэвалюцыя і праваахоўная дзейнасць: філасофскія і прававыя аспекты".

Расійскія калегі ў сваіх выступленнях закранулі праблемы ўздзеяння тэхналагічнай рэвалюцыі на праваахоўную дзейнасць, уплыву сучасных тэхналогій на інтарэсы бяспекі і свабоду асобы, выкарыстання нейрасеткавых тэхналогій у органах унутраных спраў. Прадстаўнікоў Магілёўскага інстытута больш цікавілі філасофскія аспекты праблемы: кандыдат філасофскіх навук, дацэнт **Віктар Ражкоўскі** разважаў аб праблеме права ў эпоху постмадэрну, курсант другога курса факультэта міліцыі **Уладзімір Казлоўскі** – аб жыцці новага пакалення ў камп'ютэрнай сімуляцыі.

Начальнік кафедры сацыяльна-гуманітарных дысцыплін інстытута кандыдат філалагічных навук, дацэнт **Сяргей Венідзіктаў** і начальнік кафедры філасофіі і паліталогіі Омскай акадэміі кандыдат філасофскіх навук, дацэнт **Дзмітрый Папоў** дамовіліся аб працягу супрацоўніцтва ў навуковай сферы.

*Па матэрыялах кафедры сацыяльна-гуманітарных дысцыплін*
*Фота Марыны Грамыкі*



Phoca PDF